ДУА «МІНСКІ АБЛАСНЫ ІНСТЫТУТ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ»
ЦЭНТР МЕДЫЯРЭСУРСАЎ І БІБЛІЯТЭЧНАЙ РАБОТЫ

# АДУКАЦЫЯ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

## Ў РЭСПУБЛІКАНСКІХ І АБЛАСНЫХ СМІ

СБ Беларусь сегодня

Настаўніцкая газета

Звязда

Рэспубліка

Народная газета

Мінская праўда



СНЕЖАНЬ

**«Настаўніцкая газета»** – выданне асветнікаў Рэспублікі Беларусь.
Выдаецца з 20 снежня 1945 года. Выходзіць тры разы на тыдзень.
Заснавальнік: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77.
Web-сайт: http://nastgaz.by/
E-mail: info@nastgaz.by

***19.12.2025***

**Сахно, Н.** Думаць як хімікі / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 19 снежня (№95). – С. 21.

*Артыкул прысвечаны гімназіі №3 Барысава, дзе працуе настаўніца хіміі **Наталля Альшэўская**. Педагог паказвае вучням, што хімія – гэта не набор формул, а дзіўная навука, якая ажывае ў доследах, колерах і ператварэннях.*

**Сахно, Н.** Навучанне праз дыскусію / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 19 снежня (№95). – С. 20.

*Артыкул прысвечаны гімназіі №1 Дзяржынска, дзе выкладае англійскую мову настаўніца **Аксана Вайцяхоўская**, якая спалучае ў рабоце інтэрактыўныя прыёмы, асобасна арыентаванае навучанне у супрацоўніцтве.*

**Сахно, Н.** 80 гадоў разам з педагогамі! / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 19 снежня (№95). – С. 1.

*Артыкул прысвечаны сярэдняй школе №2 Салігорска, якая багатая на дасягненні і імёны. А настаўнікі школы адданыя чытачы “Настаўніцкай газеты”, якая дапамагае больш упэўнена ісці па прафесійным шляху.*

***16.12.2025***

**Сахно, Н.** Формула ўрока / Н.Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 16 снежня (№94). – С. 8.

*Артыкул прысвечаны гімназіі Клецка, дзе настаўнік фізікі **Мікалай Слабко** разважае пра паспяховы урок, напоўнены пошукам, інтэлектуальным напружаннем і зносінамі.*

**Сахно, Н.** Тэрыторыя здароўя / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 16 снежня (№94). – С. 8.

*У сярэдняй школе №4 горада Слуцка прайшоў рэспубліканскі семінар-практыкум “Рэсурсны цэнтр: комплексны падыход да стварэння здароўезберагальнага асяроддзя ва ўстанове адукацыі”. Падчас круглага*

*стала з удзелам намесніка Міністра **Аляксандра Кадлубая** гаворка ішла пра стварэнне бяспечнага і здароўезберагальнага адукацыйнага асяроддзя.*

**Драбеня, Ф**. Ідэі і практыка / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 16 снежня (№94). – С. 8.

*Артыкул прысвечаны **фестывалю “Ідэя. Інавацыя. Будучыня”**, які адбыўся сёлета ў Мінскім абласным інстытуце развіцця адукацыі чацвёрты раз. Рэктар МАІРА **Фёдар Драбеня** адзначыў, што фестываль набыў папулярнасць і стаў важнай пляцоўкай для распаўсюджвання вопыту паспяховай практыкі рэалізацыі рэспубліканскіх інавацыйных ідэй.*

***5.12.2025***

**Міцкевіч, Л.** Смілавічы – у сэрцы / Л. Міцкевіч // Настаўніцкая газета. – 2025. – 5 снежня (№91). – С.11.

*Артыкул прысвечаны музею Халакоста “Ведаць, каб памятаць, - памятаць, каб жыць”, які знаходзіцца ў сярэдняй школе №1 Смілавіч Чэрвеньскага раёна. Педагог–метадыст **Людміла Драпеза** праводзіць экскурсіі па музеі для школьнікаў і розных дэлегацый і з’яўляецца стараннай захавальніцай гісторыі горада–паселка.*

**Сахно, Н.** Праектуем будучыню / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 5 снежня (№91). – С. 8.

*На Мінскім абласным форуме інжынернай накіраванасці “Праектуем будучыню”, які адбыўся на пляцоўцы Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, рэктар МАІРА **Фёдар Драбеня** расказаў, что мерапрыемства было арганізавана, каб павысіць кампетэнтнасць педагогаў і пашырыць супрацоўніцтва у напрамку інжынернай падрыхтоўкі вучняў.*

**Клюйко, А.** Даверлівыя адносіны / А. Клюйко // Настаўніцкая газета. – 2025. – 5 снежня (№91). – С. 8.

*Артыкул прысвечаны Плешчаніцкай сярэдняй школе №2 Лагойскага раёна. Размова ідзе з яе дырэктарам – **Таццянай Атрушкевіч**, якая ўпэўнена, что каб выхоўваць дзяцей дастойнымі грамадзянамі і працаўнікамі сваёй краіны, трэба ведаць, што ім блізка і цікава.*

***28.11.2025***

**Сахно, Н.** Добрая книга – добрае кино / Н.Сахно // Настаўніцкаягазета. – 2025. – 28 лістапада (№89). – С. 12.

*Артыкул прысвечаны цікавай и наватарскай рабоце школьнай бібліятэкі сярэдняй школы №24 Барысава, дзе яе загадчыца **Святлана***

СНЕЖАНЬ

***Яўнішкене** актыўна ўдзельнічае у раённых, абласных і рэспубліканскіх акцыях, конкурсах і семінарах.*

**Сахно, Н.** Далучыць да традыцый / Н.Сахно // Настаўніцкаягазета. – 2025. – 25 лістапада (№88). – С. 8.

*Артыкул прысвечаны сярэдняй школе №12 Слуцка, дзе настаўніца беларускай мовы і літаратуры **Наталля Чухольская** расказвае, як разнастаіць свае педагагічныя кампетэнцыі і зацікавіць дзяцей сваім прадметам, далучыць вучняў да мастацкага слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна- гістарычнага жыцця народа.*